Шыфр:___________________________

Колькасць балаў:________________

Месца:___________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта намеснік Міністра адукацыі

_________ В.А. Будкевіч

«12» _________ 2013 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Брэст, 2013 г.*

**9 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт I

**Заданне 1.** Падкрэсліце правільныя напісанні *Е* і *Э* ў запазычаных словах.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Акардзеон – акардэон, аксесуар – аксэсуар, амнэзія – амнезія, лэдзі – ледзі, бізнес – бізнэс, бюлецень – бюлетэнь, веб-сайт – вэб-сайт, энергетычны – энэргетычны, нонсенс – нонсэнс, сэрвіс – сервіс, сенсарны – сэнсарны, інэрцыя – інерцыя.

**Заданне 2.** Запішыце па *2 розныя* словы беларускай мовы, утвораныя ад наступных лацінскіх слоў.

***Узор:*** *civis ‘грамадзянін, дзяржава’ – цывілізацыя, цытадэль.*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Лацінскае слова** | **Словы ў беларускай мове з гэтымі каранямі** |
|---|---|
| **circus** ‘круг’ | |
| **corona** ‘вянок, вянец’ | |
| **bis** ‘двойчы’ | |

**Заданне 3.** Вызначце а) часцінамоўную прыналежнасць і б) сінтаксічную ролю вылучаных слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| Сказ | Часцінамоўная прыналежнасць слова | Сінтаксічная роля слова |
|---|---|---|
| 1) Штучная елка прыгожая, **затое** лясная елка – жывая і з шышкамі! | | |
| 2) Хто **за тое**, каб замовіць экскурсію ў Мірскі замак? | | |
| 3) У вёсцы з'явіліся дзве новыя крамы, **прытым** непадалёк адна ад адной. | | |
| 4) Дуб рос **пры тым** будынку, дзе летась захоўвалася сена. | | |

**Заданне 4.** Запішыце значэнне фразеалагізмаў з кампанентам ***ВОКА***.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

| Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| *адвесці вочы* | |
| *берагчы як зрэнку вока* | |
| *вочы б мае не бачылі* | |
| *глядзець вачамі каго-небудзь або чыімі* | |
| *з вока на вока* | |
| *закрываць вочы на штосьці* | |
| *кідацца ў вочы* | |
| *хоць вока выкалі* | |
| *як вокам ахапіць* | |
| *як вокам маргнуць* | |

**Заданне 5.** Запішыце, паводле якога прынцыпу размешчаны прыведзеныя словы, што іх аб'ядноўвае. Як называецца слоўнік, з якога гэтыя словы былі ўзятыя? Для чаго прызначаны такія слоўнікі?

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

абвал
авал
адвал
адмірал
аксакал
аманал
апал
арыгінал
Байкал
бал
…

1.

2.

3.

**Заданне 6.** Рашыце сэнсавыя прапорцыі.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Шырокі : вузкі = высокі : ($x_1$) ____________________ = ($x_2$) ____________________ : малады = ($x_3$) ____________________ : ціхі.

√ **Заданне 7.** Гэты беларускі мовазнавец-лексікограф, этнограф, фалькларыст, педагог, паэт, перакладчык, грамадскі дзеяч, чалавек вялікай эрудыцыі свае першыя працы прадстаўляе на суд навуковай грамадскасці ў 62 гады, а галоўную, у якой падаецца больш за 30 тыс. слоў, запісаных ім у Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, выбраных з беларускага фальклору, старабеларускіх пісьмовых помнікаў і філалагічных зборнікаў, заканчвае ў 75.

Запішыце прозвішча гэтага мовазнаўцы і назву работы, якая ствралася ім на працягу 20 гадоў.

*Максімальная колькасць балаў – 3* (1 бал – прозвішча мовазнаўцы, 2 балы – назва працы).

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ____________________

**Заданне 8.** Пісьмова адкажыце на наступныя пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (1 бал за кожны правільны адказ).

**1.** Якім зваротам пачынаецца "Мужыцкая праўда" К. Каліноўскага?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ____________________

**2.** Што паклалі сяляне на магілу Ф. Багушэвічу?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ____________________

**3.** Пра гэты верш Р. Барадуліна пісьменнік Я. Брыль пісаў: *«Трэба заўсёды быць дома, адчуваць сябе сваім у сваіх, не столькі частым, няхай сабе і шчыра радасным госцем..., але ж – у першую чаргу – і гаспадаром...».*

Як называецца гэты твор?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Трэба дома бываць часцей...

**4.** Пра якога дзеяча культуры расказваецца ў творы Янкі Сіпакова "Кантрабанда"?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Ф. Скарына

**Заданне 9.** . Запішыце нумары правільных сцверджанняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5:*

\+ 1) Галоўны маральны прынцып Ф.Багушэвіча *"... не прагнуць айчызны чужой"* зафіксаваны ў вершы "Ахвяра".

– 2) Адным з перакладчыкаў паэмы "Песня пра зубра" на сучасную беларускую мову з'яўляецца П. Панчанка. М. Багд., У. Чатрокаў, Я. Купала, Р. Барадулін

\+ 3) Кульмінацыя – гэта вяршыня ў развіцці дзеяння, вышэйшы момант яго напружання.

\+ 4) В. Дунін-Марцінкевіч карыстаўся псеўданімам Навум Прыгаворка.

– 5) З герояў "Слова пра паход Ігаравы" характарыстыка *"Уночы ваўком рыскаў, з Кіева паспяваў да пеўняў да Тмутараканя"* адпавядае Канчаку. Усяславу Чарадзею

– 6) Верш Янкі Купалы "Мужык" стаў песняй-гімнам нацыянальнага адраджэння. „А хто там ідзе?"

7) Еўфрасіння Полацкая выступіла ў ролі мецэнаткі ў музыцы.

8) У творчасці М. Багдановіча вобразам-сімвалам красы і мастацтва з'яўляецца кветка васілёк.

9) М. Гусоўскі – буйнейшы паэт-лацініст у Еўропе ў эпоху Адраджэння.

10) Ф.Скарына выступіў як заснавальнік крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ____________________________________________

**Заданне 10.** Перад вамі *цэнтон* – верш, складзены з урыўкаў розных твораў аднаго ці некалькіх паэтаў.

Запішыце імёны і прозвішчы аўтараў асобных радкоў і назвы твораў, адкуль яны ўзятыя.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –
Ўдзірванелы курган векавечны.

Курган. Купала

Не забыць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню цыбаты асвер
Запускае руку да пахі.

Трэба дома бываць часцей. Багдановіч

Зямлі родненькай, знаць, няма у вас,
Ні вугольчыка, ні прытулачку.
А тут вецер дзьме горшы раз у раз,
Леціцё жа вы без ратуначку!..

Хмаркі. Колас

АЎТАРЫ І НАЗВЫ ІХ ТВОРАЎ: ____________________________________________